ПЛАН-КАНСПЕКТ ІНТЭГРАВАНАГА ЎРОКА ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”, “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ” Ў VI КЛАСЕ ПА ТЭМЕ “ВІТАЎТ І ГРУНВАЛЬД: СЛОВА І СПРАВА”[1]

Соўкіна Ульяна Уладзіславаўна
Лук’янава Валерыя Андрэеўна

Мэта: плануецца, што да канца ўрока ў вучняў сфарміруецца ўяўленне пра гераічнае мінулае славянскіх народаў праз аналіз мастацкага адлюстравання Грунвальдскай бітвы ва ўрыўку з твора Г. Сянкевіча “Незабыўная старонка славянскай мінуўшчыны”.

Задачы:

навучыць вучняў выдзяляць ключавыя эпізоды апісання бітвы, умець вызначаць сродкі мастацкай выразнасці, якія выкарыстоўвае аўтар для стварэння вобразаў герояў;

пазнаёміць вучняў з гістарычнай асновай твора;

удасканаліць навыкі чытацкай граматнасці;

уменне работы з гістарычнымі крыніцамі;

выхоўваць патрыятызм, павагу да гістарычнага мінулага.

Тып урока: урок камбінаванай будовы.

Форма ўрока: інтэрактыўнае ўзаемадзеянне.

Форма арганізацыі вучэбнай дзейнасці: групавая (парная), індывідуальная.

Абсталяванне: прэзентацыя, музычная кампазіцыя “Вечны агонь Вітаўта”, папкі з вучэбным матэрыялам, карта Грунвальдскай бітвы, вучэбны дапаможнік па Гісторыі Беларусі.

Папераджальнае дамашняе заданне: прачытаць твор Г. Сянкевіча “Незабыўная старонка славянскай мінуўшчыны”

Ход урока

I. Арганізацыйны момант.

Паведамленне тэмы і мэты ўрока. Словы настаўнікаў.

Добры дзень, нашы дарагія вучні! Мы рады бачыць вас сёння на нашым уроку. Разумею ваша здзіўленне — убачыць адразу двух настаўнікаў. Таму, папярэджваючы вышы пытанні, скажу, што сёння мы з вамі будзем аналізаваць літаратурны твор Г. Сянкевіча “Незабыўная старонка славянскай мінуўшчыны” праз прызму гісторыі Беларусі.

Каб высветліць кірунак працы на сённяшнім уроку, прапануем вам паслухаць музычную кампазіцыю і разам вызначыць мэты і задачы ўрока.

II. Актуалізацыя тэмы.

2.1. Праслухоўванне песні “Вечны агонь Вітаўта”.

2.2. Абмеркаванне музыкальнай кампазіцыі[2]. Гутарка па пытаннях.

Настаўнік літаратуры.

Якой гістарычнай асобе прасвечана музыкальная кампазіцыя? (Вітаўт Кейстутавіч)

Абапіраючыся на змест зададзеннага вам да дому тэксту і музычнай кампазіцыі, пра якую старонку жыцця Вітаўта пойдзе размова? (Грунвальдская бітва)

Што нам трэба сёння высветліць? (Прычыны бітвы, ход бітвы, вынік. Асаблівасці аўтарскай задумы пры мастацкім апісанні бітвы).

Якія карціны бітвы вам найбольш запомніліся, усхвалявалі вас? Хто з герояў выклікаў найбольшую павагу і сімпатыю?

Настаўнік гісторыі. Раскажыце, якім вы ўяўляеце Вітаўта? Што яшчэ вы ведаеце пра нашага славутага продка?

Вучні актуалізуюць веды з курса “Гісторыя Беларусі”.

III. Вывучэнне новага матэрыяла.

3.1. Работа з інфармацыяй.

На слайдзе прэзентацыі адкрыта карта Грунвальдскай бітвы (дадатак). У вучняў на сталах ляжаць папкі з вучэбным матэрыялам.

Настаўнікі арганізуюць працу з тэкстам твора і гістарычнай картай.

3.2.Праца з тэкстам.

Настаўнік літаратуры. Прачытайце радкі з тэксту, у якіх паказана хвіліна чакання перад самым пачаткам Грунвальдскай бітвы. Звярніце ўвагу, як аўтар перадае стан прыроды перад боем. Якія мастацкія сродкі ствараюць атмасферу непазбежнасці бітвы? (Эпітэты *“змярцвелага стэпу”, “злавесная маўклівая раўніна”, “змрочны страшнаваты цень”*. Вучні могуць працытаваць з твора наступныя радкі: *“Раптам узнялася віхура. Яна зашумела ў лесе, сарвала тысячы лісцяў, кінулася ў поле, узвіхрыла сухія сцяблінкі траў, падняла хмары пылу і шпурнула іх у вочы крыжакам”.*)

Настаўнік гісторыі. Зараз мы з вамі як тыя “мясцовыя сяляне” ў творы Г. Сянкевіча. Выбралі сабе найлепшае месца, каб назіраць за бітвай. Сачыць за боем цікава, але давайце паразважаем.

Пытанне на разважанне. Як вы думаеце, чаму аўтар стварыў атмасферу немінучасці бітвы? Якія сапраўдныя гістарычныя прадумовы прывялі да гэтага славутага бою?

[1] *Урок распрацаваны на матэрыяле твора Г. Сянкевіча “Незабыўная старонка славянскай мінуўшчыны”, а таксама на матэрыяле параграфа “Вялікая вайна і Грунвальдская бітва” з курса “Гісторыя Беларусі”. Практычна прадэманстраваны спосабы фарміравання функцыянальнай адукаванасці на ўроках беларускай літаратуры. Зроблены акцэнт на метапрадметныя кампетэнцыі: аналіз, сінтэз, параўнанне, класіфікацыя, устанаўленне прычынна-следчых сувязяў, выяўленне заканамернасцей, уменне прымяняць атрыманыя веды для тлумачэння з’яў навакольнага свету. Абраная тэма добра падыходзіць для выхаваўчага патэнцыялу ўрокаў беларускай літаратуры (выхоўвае ў вучняў павагу да гістарычнага мінулага нашай краіны).*

[2] Для аналізу дастаткова і адной хвіліны.

Вучні выказваюць свае меркавенні і ўзгадваюць змест параграфа па гісторыі.

Вучні аналізуюць інфармацыю з тэксту і спрабуюць самастойна расказаць пра ход бітвы[3].

Настаўнік літаратуры. Якім паўстае Тэўтонскі ордэн на пачатку бітвы? Знайдзіце аўтарскія апісанні ў тэксце, зачытайце.

Настаўнік гісторыі. Пакажыце іх на карце.

Настаўнік літаратуры. Як аўтар апісвае войска Вітаўта на пачатку бітвы?

Настаўнік гісторыі. Хто жадае паказаць іх месца знаходжання на карце? Прыгадайце, які момант лічыцца пераломным у славутай бітве? Што пра гэта сведчыць?

Настаўнік літаратуры. Выскажыце сваё меркаванне наконт радкоў аўтара: *"Ліцвіны, якіх можна было разбіць, але нельга перамагчы…"* Як вы лічыце, які сэнс надае пісьменнік гэтым радкам? Што жадае да нас данесці? Прывядзіце доказы сваіх думак, карыстаючыся тэкстам.

Настаўнік гісторыі. Ці супадае гэта з рэальным ходам падзей?

Зварот да вучэбнага матэрыялу з курса "Гісторыя Беларусі.

Фізкультхвілінка «Грундвальдская сеча».

На фоне гучыць рытмічны барабан, на слайдзе рэпрадукцыя карціны "Грунвальдская бітва".

Мы з вамі з поспехам справіліся з рэканструкцыяй Грунвальдскай бітвы. Таму зараз прапаную вам стаць часткай сапраўднага падарожжа і падтрымаць войска Вітаўта ў гэтай слаўнай сечы!

Становімся роўна, распраўляем плечы, нібы на нас цяжкія рыцарскія даспехі.

"Славянскія прасторы" Мы крочым па пыльнай дарозе, па зямлі роднай, небрукаванай.	(Маршыруем на месцы, высока падымаючы калені.)
"Дазорцы" Глядзім удалячынь — ці не відаць там крыжакоў?	(Павароты галавы направа і налева, прыстаўляючы далонь да вачэй.)
"Лучнікі" Нацягнулі тугія лукі, зазвінела цеціва!	(Левая рука выцягнута наперад, правая з сілай адводзіцца назад. Паўтараем для абедзвюх рук.)
"Удар мячом" Меч цяжкі падымаем, славу прадзедаў абараняем!	(Рукі ў замок, падымаем над галавой і робім энергічны нахіл наперад (нібы б'ём мячом)
"Конніца Вітаўта" Паскакалі коні ў полі, зашумеў дубовы лес!	(Бег на месцы з захлёстам назад або проста хуткія падскокі.)
"Пераможны кліч" Грымнуў гром — і вораг уцякае! Слава ў паветры гучыць!	(Падымаем рукі высока ўгору, робім глыбокі ўдых і на выдыху плаўна апускаем рукі.)

Вось і скончыўся наш з вамі слаўный паход. Мы з вамі не толькі паглядзелі на гістарычную бітву, але і змаглі адчуць сябе яе часткай.

Настаўнік літаратуры. Адкажыце, вынік нашай бойкі падобны да цытаты Г. Сянкевіча: *"Князь Вітаўт быў усюды: яго голас грымеў над шэрагамі, нібы подых навальніцы, а яго нязломная воля вяла ваяроў наперад, да самаго сонца перамогі"*?

Ці адчулі вы яго "нязломную волю", якая прывяла нас да перамогі?

3.3. Словы настаўнікаў.

Сапраўды. Твор Г. Сянкевіча "Незабыўная старонка славянскай мінуўшчыны" дапамог нам адчуць настрой Грунвальдскай бітвы і ўявіць сябе часткай арміі вялікага палкаводца.

Гістарычныя факты, дапамаглі зразумець прычыны і ход канфлікту паміж ВКЛ і Тэўтонскім ордэнам. Зараз я прапаную зрабіць наша падарожжа яшчэ больш цікавым і пазнаёміцца не толькі з ходам бітвы, але і адчуць сябе часткай гэтай гісторыі.

3.4. Практычная работа: Кейс-сітуацыя "стратэгічнае рашэнне".

Вучні падзяляюцца на 3 каманды.

Камандзіры шукаюць адказы на пытанні:

Якім паказаны ў творы вялікі магістр барон Ульрык фон Юнгінген? Што мы ведаем пра яго з гісторыі?

Раскажыце, якім вы ўяўляеце Вітаўта ў творы? Як ён паводзіў сябе на полі боя? Якія гістарычныя рашэнні гэтага палкаводца прывялі да перамогі?

Якім ў творы паказаны Ягайла? Ці прымаў ён удзел у гістарычнай бітве? Якая яму адводзілася роля?

Дыпламаты уяўляюць, што з'яўляюцца дыпламатамі Вялікага Княства Літоўскага, якім трэба правесці перагаворы з крыжакамі перад Грунвальдскай бойкай. Вітаўт даў ім паручэнне напісаць ліст ад яго, Вітаўта, імя да вялікага магістра Тэўтонскага ордэна.

У лісце трэба:

а) выказаць пазіцыю сваёй дзяржавы наконт канфлікту;

б) прапанаваць мірнае рашэнне канфлікту, зыходзячы з інтарэсаў сваёй краіны;

в) указаць на магчымыя наступствы для Тэўтонскага ордэна у выпадку адмовы ад перагавораў.

Летапісцы звяртаюць увагу на кампазіцыю літаратурнага твора, мастацкія сродкі, вобразы ваяроў, асобныя дэталі, адказваюць на пытанні:

Якім настроем прасякнуты твор?

Як перададзена імклівасць, напружанасць бітвы?

Разважаюць, які сэнс укладзены ў апошнія радкі твора *"Слава і хвала табе, вялікае святое мінулае, і табе, ахвярная кроў, на векі вечныя!"*.

3.5. Слова настаўніка.

Настаўнік літаратуры. Грунвальдская бітва — важная падзея нашай гісторыі, якую мы павіны ведаць і памятаць, шанаваць мужнасць нашых продкаў, якія не шкадавалі жыцця, каб даць нам свабоду і незалежнасць.

IV. Рэфлексія.

Абапіраючыся на ўсё сказанае, сфармулюйце ас-

[3]Карта дапамагае сістэматызаваць інфармацыю.

ноўную думку твора. *(Аўтар імкнецца адлюстраваць мужнасць і гераізм ваяроў старажытнасці — непераможных ліцвінаў, заліхвацкіх немцаў. Кожны з іх адстойваў у баі свае інтарэсы, але праяўляў толькі лепшыя якасці чалавечага характару.)*

Прыём "3 М".

Нам вельмі пашанцавала, што ў гэта "падарожжа" з намі адправіліся такія дасведчаныя вучні і зрабілі яго больш цікавым і займальным. Але якое можа быць падарожжа без прыемных успамінаў пра яго? Зыходзячы з гэтага, прапануем вам узгадаць увесь наш урок і запісаць на паперу:

— 1 момант гісторыі, пра які жадаеце даведацца больш;

— 1 момант з урока, які здаўся вам складанным і патрабаваў больш намаганняў;


— 1 момант у тэме ўрока, які не зацікавіў вас.


Дадатак

Карта Грунвальдскай бітвы



Апорныя карткі





Дата поступления в редакцию: 07.05.2026